ЗАЦВЯРДЖАЮ
Намеснік начальніка аддзела адукацыі Свіслацкага райвыканкама
________________В.Ф. Чорба
17 кастрычніка 2023г.

# І ЭТАП РЭСПУБЛІКАНСКАЙ АЛІМПІЯДЫ ШКОЛЬНІКАЎ ПА БЕЛАРУСКАЙ МОВЕ І ЛІТАРАТУРЫ
## (2023/2024 навучальны год)
## Комплексная работа
## 10 клас

***Максімальная колькасць балаў -50***

| **Заданні** | 1 | 2 | 3 | 4 | 5 | 6 | 7 | 8 | 9 | 10 | **Усяго** |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| **Балы** | | | | | | | | | | | |

**Заданне 1. Якія гукі абазначаюць выдзеленыя літары? Запішыце гукі ў квадратных дужках.**

*Максімальная колькасць балаў - 5*

| | |
|---|---|
| 1). бяро**зк**а - [ ], | 6). супра**цьд**ымны -[ ], |
| 2). му**ндз**ір - [ ], | 7. хрэ**сьб**іны - [ ], |
| 3). перабе**жч**ык - [ ], | 8). спар**тс**мен - [ ], |
| 4). каўка**зс**кі - [ ], | 9). **зв**ер - [ ], |
| 5**). не** ведалі - [ ], | 10). **зг**інаць - [ ]. |

**Заданне 2. Утварыце і запішыце прыметнікі.**

*Максімальная колькасць балаў – 4*

| | |
|---|---|
| 1. без + бровы = | |
| 2. без + верх = | |
| 3. без + пошліна = | |
| 4. без + выезд = | |
| 5. не + важнасць = | |
| 6. не + спадзяванасць = | |
| 7. без + сорам = | |
| 8. не + цот = | |

**Заданне 3. З прыведзеных фразеалагізмаў утварыце сінанімічныя пары, упішыце іх у табліцу.**

*Максімальная колькасць балаў – 5*

Рассыпацца дробным макам; сесці ў лужыну; бабка надвое варажыла; шапку ў ахапку; з макава зерне; як старой бабе сесці; ламаць шапку; віламі па вадзе пісана; лахі пад пахі; сесці макам.

| Фразеалагізмы-сінонімы | |
|---|---|
| 1. | |
| 2. | |
| 3. | |
| 4. | |

| | |
|---|---|
| 5. | |

**Заданне 4. Запішыце ў пустыя клеткі табліцы адпаведныя формы слоў.**

*Максімальная колькасць балаў – 6*

| Назоўны склон, адз. л. | Родны склон, адз.л. | Месны склон, адз.л. | Назоўны склон, мн.л. |
|---|---|---|---|
| луг | | | |
| хлеб | | | |
| край | | | |
| інжынер | | | |

**Заданне 5. Перакладзіце словазлучэнні на беларускую мову.**

*Максімальная колькасць балаў – 5*

| | |
|---|---|
| сварить ботву | |
| накрашенная бровь | |
| притяжательное местоимение | |
| маленький перепелёнок | |
| проданная посуда | |

**Заданне 6. Укажыце, якой часцінай мовы і якім членам сказа з'яўляюцца выдзеленыя словы.**

*Максімальная колькасць  балаў- 5*

1. Жыццё ішло, як і звычайна, крыху марудна, аднастайна, калі **трушком**, калі ступою, сваёю бітаю трапою.
2. Дні, і вечары, і ночы бываюць такія, **калі** не маўчаць, а гаварыць хочацца.
3. **На змену** сонечным цёплым дням прыйшлі халады.
4. Лёгка толькі кашу **есці** з вялікай міскі.
5. Сын працаваў з бацькам **амаль** да раніцы.

**Заданне 7**. **Запішыце сапраўдныя імёны і прозвішчы пісьменнікаў.**

*Максімальная колькасць балаў – 5*

Цішка Гартны ___________________________________________________
Змітрок Бядуля _________________________________________________
Кузьма Чорны __________________________________________________
Кандрат Крапіва_________________________________________________
Максім Танк ____________________________________________________

**Заданне 8**. **Суаднясіце словы і іх значэнні**

*Максімальная колькасць балаў -5*

| | |
|---|---|
| А) тэрцэн | 1) тры адносна самастойныя творы, якія аб'ядноўваюцца ў адзіны цыкл агульнасцю задумы, галоўных герояў, пераемнасцю сэжэта |
| Б) трыпціх | 2) трохскладовая стапа з націскам на першым складзе |
| В) трылогія | 3) трохрадкоўе |
| Г) амфібрахій | 4)трохскладовая стапа з націскам на другім складзе |
| Д) дактыль | 5) паэтычны твор з трох адносна самастойных вершаў |

**АДКАЗ : ______________________________________________________**

**Заданне 9. Што па-мастацку яднае наступныя творы: Максіма Багдановіча “Санет” (“Паміж пяскоў Егіпецкай зямлі...”), Янкі Купалы “Роднае слова”, Якуба Коласа “Родныя вобразы”?**

*Максімальная колькасць балаў — 5*

**Адказы ТАК або НЕ**

а) Гэта вершы патрыятычнага гучання;

б) Гэта творы, напісаныя ў XIX ст., калі адбывалася фармаванне беларусаў як нацыі;

в) Гэта творы, напісаныя аўтарамі-мужчынамі, і ў іх выразна адлюстраваны погляд на свет у адпаведнасці з прафесіяй аўтара;

г) Гэтыя творы маюць выразную сюжэтную лінію і, адпаведна, адносяцца да эпічнага роду літаратуры;

д) У гэтых творах у лірычнай, вершаванай форме аўтары выказваюць сваю любоў і пашану да роднага краю, веру ў яго будучыню.

**АДКАЗ: ТАК ______________________________**
**АДКАЗ: НЕ ______________________________**

**Заданне 10. Прачытайце верш. Устаўце прапушчаныя словы, назавіце твор і яго аўтара.**

*Максімальная колькасць балаў – 5*

Зорка Венера ўзышла над зямлёю,
Светлыя _________ з сабой прывяла...
Помніш, калі я спаткаўся з табою,
Зорка Венера ўзышла.
З гэтай пары я пачаў углядацца
Ў неба начное і зорку шукаў.
Ціхім каханнем к табе разгарацца
З гэтай пары я пачаў.
Але расстацца нам час наступае;
Пэўна, ўжо доля такая у нас.
Моцна кахаў я цябе, дарагая,
Але расстацца нам час.
Буду ў далёкім краю я нудзіцца,
У сэрцы любоў затаіўшы сваю;
Кожную ночку на зорку _____________
Буду ў далёкім краю.
Глянь іншы раз на яе, _______________
Там з ёй зліём мы пагляды свае...
Каб хоць на міг уваскрэсла каханне,
Глянь іншы раз на яе...

НАЗВА ТВОРА:_______________________________

АЎТАР ТВОРА:________________________________